**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

УДК: 070:654.197(476)(091)

**МАРОЗАВА**
**Алена Ігараўна**

# ПАДАРОЖНЫ НАРЫС НА БЕЛАРУСКІМ ТЭЛЕБАЧАННІ: ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРУ

АЎТАРЭФЕРАТ
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.10 – журналістыка

Мінск, 2020

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – **Арлова Таццяна Дзмітрыеўна**,
доктар філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры мастацкай
творчасці і прадзюсарства
Прыватнай установы адукацыі
«Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава»

Афіцыйныя апаненты: **Тычко Галіна Казіміраўна,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры перыядычнага друку
і вэб-журналістыкі Беларускага
дзяржаўнага ўніверсітэта

**Мядзведзева Вольга Аляксандраўна,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры менеджмента,
гісторыі і тэорыі экранных мастацтваў
Установы адукацыі «Беларуская
дзяржаўная акадэмія мастацтваў».

Апаніруючая арганізацыя – Установа адукацыі
«Гродненскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Янкі Купалы

Абарона адбудзецца 23 кастрычніка 2020 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.08 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, д. 8 (корпус юрыдычнага факультэта), аўд. 407. Тэлефон вучонага сакратара: (+375 17) 259-70-24.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы БДУ.

Аўтарэферат разасланы «      » верасня 2020 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л. П. Саянкова-Мельніцкая

# УВОДЗІНЫ

Публіцыстычны падарожны нарыс зноў стаў актуальным у аўдыявізуальнай прасторы. Ва ўмовах шырокай даступнасці інфармацыі больш каштоўным, чым факт, становіцца меркаванне, уласны абгрунтаваны погляд. Найбольш запатрабаваная форма відэаблогу – прыватнага дзённіка падзей – заўсёды ўтрымлівае аповед аб вандроўцы, якая стала часткай жыцця амаль кожнага чалавека. Папулярнасці падарожных нарысаў садзейнічае ўдасканаленне лагістыкі, развіццё турыстычнай інфраструктуры па ўсім свеце. Станаўленне нацыянальнай школы падарожнай журналістыкі спрыяе развіццю ўнутранага турызму, а значыць, і павышэнню ўзроўню занятасці насельніцтва, павелічэнню знешняга тавараздвароту, прыцягненню інвестыцый, што адпавядае задачам дзяржаўнай праграмы «Беларусь гасцінная».

Разам з тым падарожныя нарысы сёння настолькі шчыльна звязаныя з жыццём, што аўдыторыя вельмі часта выкарыстоўвае іх як замену сапраўднай вандроўкі. Уяўленне вялікай колькасці людзей аб краінах і мясцінах грунтуецца выключна на звестках са СМІ. Высокі ўзровень даверу, якім карыстаюцца падарожныя нарысы сярод аўдыторыі, абумоўлены тым, што аўтар у іх распавядае пра сваю вандроўку ад першай асобы, спасылаючыся на ўласны вопыт, звяртаецца да гледачоў непасрэдна. Пры гэтым варта вызначыць перавагу тэлевізійных выпускаў, таму што яны паказваюць геаграфічныя аб’екты і жыццё найбольш рэалістычна, дазваляюць стварыць эфект прысутнасці. Гэта робіць іх эфектыўным сродкам распаўсюджання нацыянальных сімвалаў, беларускай ідэалогіі. Падарожныя нарысы спрыяюць узмацненню пачуцця патрыятызму, развіццю нацыянальнай ідэі. Вандроўнік, які апынуўся ў незнаёмым асяроддзі, пачынае адчуваць сувязь з радзімай, з яе людзьмі, прыродай, традыцыямі, гэта дае веру ў сябе, прагу да стваральнай працы на карысць краіны. Падарожная журналістыка дапамагае асэнсаваць і зберагчы нормы нацыянальнай культуры, разуменне агульнага і адметнага ў ладзе і светапоглядах розных народаў становіцца падставай для пошуку шляхоў узаемнавыгаднага супрацоўніцтва ў глабальным свеце, што адпавядае ідэям Дэкларацыі Ўсходняга партнёрства.

У апошнія гады тэлевізійную журналістыку падарожжаў неабгрунтавана звязваюць выключна з рэкламнымі і забаўляльнымі перадачамі. Аднак, як сведчыць гістарычны вопыт, людзі спрадвек накіроўваліся ў іншыя мясціны, каб набыць новыя веды, літаратура падарожжаў спрыяла станаўленню навуковай карціны рэчаіснасці.

Асаблівасці і працэс эвалюцыі літаратуры падарожжаў разгледжаны ў работах Т. Рабалі, Я. Журбіной, Н. Маславай, М. Гумінскага, Г. Лаўрынеўскай, С. Гараніна, К. Панцэрава. Асобныя перадачы ў жанры падарожнага нарыса прааналізавала Л. Шылава ў 1960-я гг., аднак у той час жанр знаходзіўся на

пачатку развіцця, што не дазваляла вызначыць яго як з’яву нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры. Трэвел-журналістыцы сучаснага расійскага тэлебачання прысвечаныя артыкулы І. Паказаньевай, М. Крыўцова, М. Шумава, А. Муха і Н. Федасеевай, В. Бабенка, Л. Бахвалавай, А. Сяргеевай і Н. Фраловай. Развіццё журналістыкі падарожжаў у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі вывучаюць М. С. Дамк’ер і А. М. Ваадэ (M. S. Damkojer & A. M. Waade), Э. Фёрсіч і А. П. Кавуры (E. Fürsich & A. P. Kavoori), З. Робертс (Z. Roberts). Аднак даследавання працэсу развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса на матэрыяле беларускага тэлебачання дагэтуль не праводзілася.

Вывучэнне жанру стала асабліва актуальным у XXI ст., калі аўдыявізуальная камунікацыя перажывае змены, па значнасці параўнальныя з тымі, што адбываліся ў сярэдзіне 1950-х гг. Тады новым каналам распаўсюджання, які варта было засвоіць, з’яўлялася тэлебачанне, зараз гэта інтэрнэт. Відэаблогі аб падарожжах вельмі нагадваюць гутаркі і ілюстраваныя апавяданні. Тады не існавала выпрацаваных шаблонаў, адбываўся творчы пошук у галіне зместу і формы, вынаходніцтвы былі непазбежныя. Прагрэс ідэй апярэджваў развіццё тэхнікі, таму шматлікія наватарскія прыёмы творцы не здолелі ўвасобіць належным чынам. У час імклівага прагрэсу да гэтага вопыту варта звярнуцца, на новай глебе ён можа падштурхнуць да неардынарных і эфектыўных рашэнняў, якія будуць спрыяць павышэнню прафесійнай вартасці і канкурэнтаздольнасці перадач беларускага тэлебачання.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» 2016–2020 гг., зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 483 ад 10.06.2015 г. (падпраграма 1 – «Гісторыя і культура»), у межах планавай навукова-даследчай тэмы кафедры тэлебачання і радыёвяшчання факультэта журналістыкі БДУ «Эвалюцыя творчага патэнцыялу тэлебачання і радыёвяшчання ў працэсе трансфармацыі вытворчасці кантэнту аўдыявізуальных сродкаў масавай інфармацыі Рэспублікі Беларусь (2018–2022 гг., нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20180337). Работа адпавядае прыярытэтным кірункам дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2018 г. № 247 «О проведении Года малой родины».

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта дысертацыі* – вызначэнне асаблівасцей функцыянавання і развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса як з’явы нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры ў гістарычным аспекце.

Дасягненню мэты служыць вырашэнне наступных *задач:*

1. Вызначыць жанрафарміруючыя прыкметы тэлевізійнага падарожнага нарыса, прапанаваць яго дэфініцыю;

2. Высветліць асаблівасці генезісу падарожнага нарыса на беларускім тэлебачанні, паказаць уласцівую для яго сістэму сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці;

3. Ахарактарызаваць заканамернасці трансфармацыі асноўных адметнасцей жанру, выявіць яго тэматычную разнастайнасць;

4. Вылучыць нацыянальную спецыфіку падарожнага нарыса беларускага тэлебачання;

5. Прапанаваць кірунак развіцця, перспектыўныя формы, сродкі і прыёмы мастацкай выразнасці жанру ў XXI ст.

*Аб'ект даследавання* – жанр тэлевізійнага падарожнага нарыса як з'ява нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры.

*Прадмет даследавання* – развіццё жанраўтваральных прыкмет, сістэмы сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці тэлевізійнага падарожнага нарыса.

*Межы даследавання* – з 1956 г. (год заснавання беларускага тэлебачання) да 2018 г.

**Навуковая навізна**. Упершыню ў беларускай журналісцкай навуцы дадзена характарыстыка жанраўтваральных прыкмет, сістэмы сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці тэлевізійнага падарожнага нарыса ў працэсе гістарычнага развіцця нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры і фарміравання беларускай школы тэлевізійнай журналістыкі. У навуковы дыскурс уведзены раней не даследаваныя сцэнарыі перадач беларускага тэлебачання сярэдзіны 1950–1990-х гг.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Падарожны тэленарыс – гэта жанр журналістыкі, асноўная мэта якога – фарміраванне вобразу геаграфічнай мясцовасці – рэалізуецца ў сістэме жанраўтваральных прыкмет, у ліку якіх абвостраная дынаміка паведамлення, мастацкі, публіцыстычны і філасофскі складнікі, суб'ектывізм. Выразны аўтарскі пачатак падарожнага тэленарыса вызначае яго перспектывы ва ўмовах узмацнення персаніфікацыі інфармацыі на тэлебачанні і ў інтэрнэце.

2. Падарожны нарыс беларускага тэлебачання грунтуецца на літаратурнай традыцыі, звязанай з творчасцю класікаў І. Мележа, С. Грахоўскага, Г. Бураўкіна, У. Караткевіча. Развіццё формаў аўдыявізуальнай камунікацыі – гутаркі, ілюстраванага апавядання, тэлечасопіса, тэлеклуба, цыклавой перадачы, тэлефільма, травелогу і інш. – абумовіла станаўленне аўдыявізуальнага тыпу нарыса. Ён характарызуецца асаблівай мовай, для якой уласціва выкарыстанне акалічнасцей месца, указальных займеннікаў, кароткіх формаў дзеепрыметнікаў, акругленых лічбаў, тропаў з яркай эмацыянальна-ацэначнай афарбоўкай, жарганізмаў, займенніка «ты» ў абагульненым значэнні, метанімій, часу

дзеясловаў у пераносным значэнні, рытарычных пытанняў, а таксама сістэмай спецыфічных сродкаў і прыёмаў экраннай выразнасці (суб'ектыўная і «жывая» камера, персаніфікацыя аўдыторыі і здымачнай групы, уключэнне песень, акцэнт на дэталі і інш.).

3. Развіццё падарожнага тэленарыса на тэматычным узроўні вызначаецца перавагай тэмы Радзімы, што пачынае асэнсоўвацца як агульначалавечая каштоўнасць, звязаная з тэмамі сям'і, прыроды, сяброўства, гісторыі, на драматургічным узроўні – узмацненнем унутранага канфлікту аўтара-апавядальніка, фарміраваннем палемічнага характару яго дыялогу з аўдыторыяй. На мастацкім узроўні вызначаецца паглыбленне творчай самастойнасці аўтараў: ад пераймання літаратурных вобразаў-сімвалаў яны пераходзяць да стварэння ўласных архетыпаў. Заканамернасці развіцця жанру дэтэрмінуюць яго важную ролю ў назапашванні і перадачы каштоўнасцей нацыянальнай культуры, рэалізацыі прыярытэтных арыенціраў дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, такіх як узмацненне ролі сям'і, выхаванне патрыятызму, грамадзянскай адказнасці, матывацыя людзей да эфектыўнай працы.

4. Каштоўнай часткай беларускай аўдыявізуальнай культуры з'яўляецца феномен турыстычнага нарыса, які адлюстроўваў погляды сваіх стваральнікаў, прадстаўнікоў навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, у тым ліку турыстаў-аматараў і паэтаў-песеннікаў, уздзейнічаў на грамадскі кантэкст і тэлевытворчасць, спрыяў захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей, развіццю сацыяльнага супрацоўніцтва і грамадскай ініцыятывы, павышэнню прэстыжу адукацыі і ведаў. Турыстычны нарыс адпавядае актуальнай аўдыявізуальнай форме «падарожжа турыста з заплечнікам», аднак, каб ствараць на яго падставе ўнікальныя беларускія фарматы перадач для міжнароднага распаўсюджання, неабходна выкарыстоўваць выпрацаваныя гістарычна матывы сінкрэтызму, антрапацэнтрызму, разумення сяброўства як найвышэйшай каштоўнасці, адраджаць мультымедыйнасць жанру, яго сувязь з навуковым дыскурсам.

5. Дамінуючым кірункам развіцця падарожнага тэленарыса ў XXI ст. з'яўляецца яго збліжэнне з рэпартажам. Разам з тым травелог як жанравая форма падарожнага нарыса працягвае традыцыі гісторыка-культурных перадач беларускага тэлебачання і мае перспектывы ў аўдыявізуальнай прасторы XXI ст. Каб рэалізаваць ролю жанру ў назапашванні і перадачы каштоўнасцей нацыянальнай духоўнай культуры, неабходна ўвасобіць на новым тэхнічным узроўні выпрацаваныя вопытам прыёмы і сродкі мастацкай выразнасці, у тым ліку аўдыяльныя, візуальныя і графічныя спецэфекты, мастацкі сімвалізм, інтэртэкстуальнасць, матыў журналісцкага расследавання.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені.** Вызначаны асаблівасці генезісу і тэндэнцыі развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса на айчынным тэлебачанні, вылучаны яго жанраўтваральныя прыкметы і сродкі мастацкай

выразнасці, якія могуць узбагаціць нацыянальную аўдыявізуальную культуру. Дысертацыя стала вынікам асэнсавання ўласнай практычнай дзейнасці (аўтар даследавання – сцэнарыст і вядучая перадачы «Путеводитель» (МТРК «Мір»)). Дысертацыя, а таксама навуковыя артыкулы па тэме даследавання выкананы аўтарам самастойна і без суаўтарства.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Тэарэтычныя вынікі і практычныя рэкамендацыі, выкладзеныя ў дысертацыі, абмеркаваны на 11 навукова-практычных канферэнцыях, з якіх шэсць – міжнародныя: «Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы» (Мінск, 16–17.11.2017), «Мультимедийная журналистика» (Мінск, 1–2.03.2018), «Современная философия и национальный культурный ландшафт» (Мінск, 21.03.2018), «75-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета» (Мінск, 14–23.2018), «Журналістыка-2018: стан, праблемы і перспектывы» (Мінск, 15–16.11.2018), «Традиции и современное состояние культуры и искусств» (Мінск, 13–14.09.2018), «Слова ў кантэксце часу» (Мінск, 14–15.03.2018), «Аудиовизуальные медиа в условиях трансформации социокультурной среды» (Мінск, 5.04.2019), «Журналістыка-2019: стан, праблемы і перспектывы» (Мінск, 14–15.11.2019), «Профессиональная коммуникативная личность в институциональных дискурсах» (Мінск, 22–23.03.2018), «Региональные СМИ Республики Беларусь в цифровую эпоху: от локальной проблематики к обеспечения информационной безопасности государства: проблемы, вызовы, перспективы» (Мінск, 29–30.04.2020). Рэкамендацыі, змешчаныя ў дысертацыі, укаранёны ў вытворчасць рэдакцый СМІ, у вучэбны працэс падчас выкладання дысцыплін «Асновы тэлежурналістыкі», «Прафмайстэрства тэлежурналіста», «Рэпарцёр тэлебачання». Асноўныя палажэнні дысертацыі могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы журналістаў па спецыяльнасцях «Журналістыка (аўдыявізуальная), для распрацоўкі адпаведных вучэбных праграм на факультэце журналістыкі БДУ, а таксама ў журналісцкай практыцы.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы дысертацыі выкладзены ў дзевятнаццаці працах агульным абъёмам 7,1 аўтарскага аркуша, сярод якіх 8 артыкулаў у рэцэнзаваных выданнях (3,8 аўт. арк.), 4 артыкулы ў зборніках навуковых прац, 7 матэрыялаў навукова-практычных канферэнцый, круглых сталоў.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і дадаткаў. Аб'ём дысертацыі – 142 старонкі, уключаючы 9 архіўных фотаздымкаў. Бібліяграфічны спіс займае 15 старонак і складаецца з 268 крыніц, у тым ліку 19 публікацый аўтара. Дадатак уяўляе сабою CD-дыск, дзе захоўваецца 10 тэлеперадач у жанры падарожнага нарыса за 2009–2017 гг. вытворчасці МТРК «Мір», сцэнарыстам і вядучай якіх з'яўляецца дысертант.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У **главе 1 «Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання жанру тэлевізійнага падарожнага нарыса»** даецца агульны агляд сучаснага стану вывучэння тэлевізійнага падарожнага нарыса.

У **раздзеле 1.1 «Нарыс як спосаб засваення і адлюстравання рэчаіснасці»** «трэвэл-журналістыка» (журналістыка падарожжаў) вызначаецца як кірунак тэлевізійнай журналістыкі, прадстаўлены перадачамі, прысвечанымі вандроўкам (І. Ёлкіна, І. Паказаньева, Н. Фралова, М. Шумаў). Пад жанрам маецца на ўвазе асобы спосаб засваення і асэнсавання рэчаіснасці (Б. Стральцоў, Т. Арлова, Ю. Тынянаў, М. Бахцін, Э. Багіраў, Р. Барэцкі), дыялогу аўтара з аўдыторыяй (С. Ільчанка, M. S. Damkojer & A. M. Waade) пры дапамозе адмысловых сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці, пад формай (гутарка, ілюстраванае апавяданне, тэлечасопіс, цыклавая перадача, і інш.) – спосаб падачы матэрыялу ў эфір (Л. Шылава, М. Барманкулаў, Э. Багіраў, Р. Барэцкі, І. Пархоменка). Падкрэсліваецца, што некаторыя формы (тэлефільм у 1980-я гг., травелог і «падарожжа турыста з заплечнікам» у XXI ст.) паступова набываюць устойлівыя жанравыя прыкметы. Вызначаецца існаванне ў тэлевізійнай журналістыцы падарожжаў гібрыдных формаў, што абумоўлівае неабходнасць выкарыстання пры вывучэнні жанравых трансфармацый прынцыпу «дамінуючай мадэлі» («dominant mode», B. Nichols). Формы, распрацаваныя для міжнароднага распаўсюджвання і лакальнай адаптацыі, называюць фарматамі перадач (A. Esser).

У **раздзеле 1.2 «Мастацкая структура падарожнага нарыса»** на падставе аналізу работ даследчыкаў тэлевізійнай журналістыкі падарожжаў (І. Гегелавай, І. Ёлкінай, А. Ларынай, І. Паказаньевай, І. Пархоменка, Н. Булейка, В. Бабенка, M. S. Damkojer & A. M. Waade), тэарэтыкаў тэлебачання (С. Ільчанкі, Э. Багірава, Р. Барэцкага, А. Юроўскага, В. Цвіка, М. Барманкулава, Л. Шылавай, В. Нячай), даследчыкаў нарыса ў друку (Н. Чарапанавай, А. Майга, Н. Маславай, Т. Рабалі, Я. Журбіной, Т. Арловай, Б. Стральцова) вылучаны пяць жанраўтваральных прыкмет тэлевізійнага падарожнага нарыса: абвостраная дынаміка паведамлення (асноўная тэма – перамяшчэнне ў прасторы і мэта – фарміраванне вобразу геаграфічнай мясцовасці, чаго няма ў партрэтным нарысе), суб'ектывізм (*прадмет* адлюстравання – чалавек і яго дзейнасць, што адрознівае нарыс ад падарожных нататак, агляду, жанру «парад» [М. Крыўцоў]), публіцыстычны (асноўная *функцыя* жанру – крытычная), а таксама мастацкі і філасофскі складнікі, нарыс, у адрозненне ад трэвэл-рэпартажа, прадугледжвае *метад* засваення рэчаіснасці шляхам філасофскіх разваг, абагульненняў, стварэння мастацкіх вобразаў.

У **раздзеле 1.3 «Метадалогія даследавання тэлевізійнага жанру»** паказана правамернасць прымянення сістэмнага падыходу – вывучэння

тэлевізійнага падарожнага нарыса як сістэмы з характэрным наборам адметнасцей. Абгрунтавана неабходнасць выкарыстання дыяхранічнага падыходу, у тым ліку якаснага кантэнт-аналізу (Э. Багіраў, Р. Барэцкі, А. Юроўскі, В. Цвік, Л. Шылава, І. Пархоменка, Н. Булейка, В. Бабенка, А. Анохін), колькаснага кантэнт-аналізу (Г. Лаўрынеўская), семіятычнага (Z. Roberts, E. Fürsich, A. P. Kavoori), параўнальна-гістарычнага (Л. Шылава) метадаў, а таксама дыскурс-аналізу (В. Гумінскі, В. Бабенка, М. Крыўцоў, А. Рэвенка, І. Паказаньева, К. Панцэраў), у межах якіх паказчыкам развіцця жанру з’яўляецца трансфармацыя яго асноўных адметнасцей, што выражаецца ў эвалюцыі адпаведных ім сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці. Асноўнымі фактарамі гэтага працэсу вызначаны тэхнічны прагрэс і трансфармацыя светапоглядаў грамадства (Н. Фральцова, Р. Ільін, Р. Капылова, М. Галдоўская і інш.). Большасць перадач аб падарожжах 1960–1980-х гг. захавалася толькі ў выглядзе друкаваных сцэнарыяў, чым вызначаецца неабходнасць ужывання пры іх даследаванні міждысцыплінарнай метадалогіі, якая грунтуецца на работах па тэорыі журналістыкі, сацыялогіі, мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, культуралогіі, філасофіі культуры. Перыяды развіцця жанру вылучаны адпаведна з этапамі эвалюцыі сусветнай цывілізацыі (В. Сцёпін, А. Зелянкоў, U. Beck, R. Robertson, K. Ohmae, M. Waters і інш.) – мадэрнізм, постмадэрнізм, глабалізацыя.

У **главе 2 «Генезіс публіцыстычнага падарожнага тэленарыса»** вызначана, што тэлевізійны падарожны нарыс бярэ вытокі ў літаратурнай традыцыі і развіваецца эвалюцыйным шляхам пад уплывам тэхнічнага прагрэсу і трансфармацыі светапоглядаў грамадства. Прасочваецца наяўнасць у перадачах уласцівых для грамадства мадэрнізму ідэй аб чалавеку як уладару прыроды, няспынным прагрэсе, звязаным з развіццём тэхнікі, супрацьпастаўлення «сваёй» камуністычнай і «чужой» капіталістычнай прасторы і інш. Вызначаецца эвалюцыя сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці падарожнага тэленарыса ад адаптацыі літаратурных да выпрацоўкі адметных тэлевізійных.

У **раздзеле 2.1 «Падарожны нарыс на пачатку існавання нацыянальнага тэлебачання: кірункі трансфармацыі друкаванага жанру»** эмпірычным матэрыялам стала «Падарожжа вакол Еўропы» І. Мележа, створанае па матывах сусветнай вандроўкі аўтара ў складзе савецкай дэлегацыі. Шляхам параўнання перадачы з друкаваным творам пісьменніка «Вакол Еўропы» («Полымя», 1956 г.) паказана, што тэлевізійны падарожны нарыс беларускага тэлебачання з’явіўся на аснове літаратуры падарожжаў, пераняў яе адметнасці, з увядзеннем аўдыявізуальных тэхналогій быў створаны новы тып нарыса – тэлевізійны. Ён увабраў характэрныя для друкаванага жанру прыёмы мастацкай выразнасці (кантраст, інтрыга, анонс, дыялагізаваны маналог) і сродкі (аўтабіяграфічныя эпізоды, дыялектныя выразы і інш.). Сярод першых тэлевізійных сродкаў мастацкай выразнасці жанру былі міміка, інтанацыя,

фотаздымкі і г. д. Вызначана, што І. Мележ звярнуўся да філасофскіх тэм, у прыватнасці да ўзаемаадносін асобы і грамадства, Радзімы, гісторыі, прыроды, працягваў традыцыі беларускага адраджэння.

У **раздзеле 2.2 «Станаўленне аўтарскай тэлежурналістыкі падарожжаў у творчасці беларускіх савецкіх пісьменнікаў»** паказана, што падарожны нарыс не губляе суб'ектывізму нават ва ўмовах фарміравання калектыўнага характару творчасці. Аўтарамі-вядучымі перадач аб вандроўках у сярэдзіне 1960-х – сярэдзіне 1970-х гг. былі выдатныя пісьменнікі, паэты, журналісты, пазней – фотамастакі і кінааператары, у тым ліку С. Грахоўскі, Г. Бураўкін, А. Сімураў, Э. Луканская, Ю. Іваноў і інш., якія здолелі надаць філасофскага зместу публіцыстычным вобразам савецкага часу.У ілюстраваных апавяданнях 1960–1970-х гг. паглыбляўся антрапацэнтрызм жанру, псіхалагізм вобразаў герояў, стаў больш даверным дыялог вядучага з аўдыторыяй. Набылі распаўсюджанне прыём алітаратурвання аўтарскай асобы, вершы і рэпартажныя фотаздымкі як сродкі мастацкай выразнасці.

У **раздзеле 2.3 «Падарожныя нарысы рэдакцыі грамадска-палітычных перадач»** паказана ўзмацненне публіцыстычнага характару жанру, эвалюцыя вобраза аўтара ад эталона да чалавека з народа ў сярэдзіне 1960-х – сярэдзіне 1970-х гг. Вызначаныя прыёмы мастацкай выразнасці – авантура, шматкамерныя здымкі, кантраст і інш. Высветленыя супярэчнасці, якія склалі падмурак для далейшай эвалюцыі жанру – ідэя «глабальнага свету» і «свайго дому», вобраз чалавека-пакарыцеля прыроды і яе часткі, адначасовае выкарыстанне элементаў афіцыйна-справавога стылю і мастацкіх вобразаў.

У **раздзеле 2.4 «Развіццё рэпартажнага метаду падарожнага нарыса ў працэсе ўдасканалення тэхналогіі прамаэфірнага вяшчання»** на прыкладзе выпускаў перадачы «Улицы и площади рассказывают» сярэдзіны 1960-х – сярэдзіны 1970-х гг. паказана, як засваенне перасоўных тэлевізійных станцый (ПТС) і актуалізацыя тэмы Вялікай Айчыннай вайны паглыбілі выкарыстанне рэпартажнага метаду выкладу падзей, што спрыяла ўзмацненню дынамікі паведамлення. Вызначана паглыбленне тэмы захавання гісторыка-культурнай памяці. Паказана, што адметнасцю выпускаў стаў дакументалізм, пачалося фарміраванне рамантычнай скіраванасці перадач. З адмысловых прыёмаў мастацкай выразнасці атрымалі развіццё метад інтэрв'ю, персаніфікацыя, мастацкая тыпізацыя, матыў расследавання. Новымі сродкамі выразнасці сталі дакументальныя і пастановачныя гукавыя сцэны, архіўныя фотаздымкі і дакументы, кінахроніка. Вобраз аўтара-апавядальніка эвалюцыянаваў ад чалавека з народа да рэпарцёра, што спалучаў рысы эталона і простага грамадзяніна.

У **главе 3 «Станаўленне падарожнага нарыса як з'явы аўдыявізуальнай культуры»** паказана, што пад уздзеяннем прагрэсу партатыўнай тэхнікі паглыбляўся дакументалізм выпускаў, павялічвалася роля

аўтара. У падарожным нарысе адлюстраваныя погляды прадстаўнікоў інтэлігенцыі, у тым ліку пісьменнікаў і паэтаў-песенікаў, якія пераважна былі сцэнарыстамі выпускаў. Прасочваецца эвалюцыя вобраза аўтара-апавядальніка ад рэпарцёра да рамантыка-інтэлігента, трансфармацыя канфлікту перадач ад супрацьстаяння паміж капіталістычным і камуністычным грамадствам да ўнутранага канфлікту героя. Вызначаецца паглыбленне філасофскага складніка жанру, замежны лад і гістарычнае мінулае пачынаюць разглядацца не як варожае і недасканалае, а як крыніцы вопыту. Выяўлена ўзмацненне публіцыстычнага складніка (тэмы экалогіі, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, сацыяльная праблематыка). Апісаны феномен рамантычнага турыстычнага нарыса як перспектыўны для сучаснай аўдыявізуальнай прасторы. У перадачах вылучаюцца характэрныя для мастацтва постмадэрнізму прыёмы, у тым ліку інтэртэкстуальнасць, іронія, элементы шоу. Паказанае паглыбленне ў падарожным нарысе тэмы этнаграфіі, узаемапранікненне падарожнага і партрэтнага нарысаў.

У **раздзеле 3.1 «Фарміраванне нацыянальнай своеасаблівасці жанру ў рэчышчы развіцця мастацкага тэлевяшчання»** паказана, што аўтары перадач звярталіся да агульначалавечых каштоўнасцей, такіх як сяброўства, сям'я, Радзіма, гісторыя, прырода і інш., што спрыяе ўсталяванню выключнай ролі падарожнага нарыса ў выхаванні патрыятызму, грамадзянскай адказнасці, матывацыі людзей да эфектыўнай працы, інтэграцыі беларускай культуры ў сусветную супольнасць.

У **параграфе 3.1.1 «Кінааматары на тэлебачанні: актуалізацыя суб'ектывізму і мастацкага складніка падарожнага нарыса»** вызначаецца, што творчасць кінааматараў паўплывала на развіццё тэлевізійнага падарожнага нарыса асабліва ў 1970-я гг., значна ўзмацніўшы яго аўтарскі характар і мастацкі складнік. У якасці сродкаў мастацкай выразнасці пачалі выкарыстоўваць вершы філасофскай лірыкі і музыку. Рамантычная скіраванасць жанру праявілася ў замілаванні прыродай і ва ўсведамленні сяброўства як каштоўнасці, у паглыбленні ўвагі да думак і пачуццяў простага чалавека.

У **параграфе 3.1.2 «Увасабленне тэмы Радзімы ў падарожных нарысах цыкла «Спадчына» Уладзіміра Караткевіча»** даследаваныя мікрафонныя папкі перадачы «Спадчына», заснавальнікам, аўтарам і вядучым першых выпускаў якой быў класік айчыннай літаратуры У. Караткевіч. Перадача стала адметнай з'явай нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры. У выпусках прасочваюцца рысы філасофіі экзістэнцыялізму, ідэі сінкрэтызму, гістарызм, інтэртэкстуальнасць. Вызначаецца сувязь падарожных нарысаў з друкаванай спадчынай У. Караткевіча і Я. Купалы – лейтматывы Дрэва Вечнасці, Радзімы, неўміручай Прыроды і інш. Адмысловымі сродкамі мастацкай выразнасці сталі

прастамоўныя словы і выразы, спецэфекты, сюжэтныя палотны мастакоў, вобразы-сімвалы ў візуальным афармленні студыі і г. д.

У **параграфе 3.1.3 «Мастацкія сродкі і прыёмы філасофскага асэнсавання жыцця ў падарожных нарысах ТА “Тэлефільм”»** паказана, як у працэсе творчага пошуку рэжысёры і сцэнарысты ТА «Тэлефільм» (1964–2001 гг.) распрацоўвалі аўтарскія прыёмы (прыём суб’ектыўнай камеры, кантраст вобразаў герояў, увод героя-маскі і інш.) і адмысловыя сродкі выразнасці (нестандартныя ракурсы, графіку, спецэфекты) падарожнага тэленарыса. Вобразы персанажаў эвалюцыянавалі ад тыповых грамадзян да асоб з адметнымі характарамі. Паказана трансфармацыя характару дыялогу героя з аўдыторыяй ад імкнення паведаміць і пераканаць да споведзі, дыскусіі і нават палемікі (у 1980–1990-я гг.), у сувязі з чым пашырылася выкарыстанне эмацыянальна-афарбаванай лексікі.

**У раздзеле 3.2 «Феномен беларускага рамантычнага турыстычнага нарыса»** прасочваецца генезіс турыстычнага нарыса як адметнай з’явы айчыннай аўдыявізуальнай культуры.

У **параграфе 3.2.1 «Сувязь тэлевізійнага падарожнага нарыса з літаратурай»** даказана, што вобраз героя праграмы інтэлігента-рамантыка мае літаратурныя прататыпы, у тым ліку А. Грэй (герой А. Грына), Маленькі прынц (персанаж А. дэ Сент-Экзюперы), Дон Кіхот (вобраз М. Сервантэса). Ад пераймання літаратурных вобразаў аўтары перадач пастунова перайшлі да стварэння ўласных архетыпаў (кветка-эдэльвейс, вобраз паэта-песенніка А. Крупа, свечка як сімвал дома). Паказана сувязь цыкла «Вецер вандраванняў» з творчасцю паэтаў Срэбранага стагоддзя, самадзейных аўтараў-песеннікаў. У выпусках перадачы прасочваецца вобраз героя, які імкнецца пабудаваць ідэальны свет, замацоўваецца распачатае ў серыях «Спадчыны» разуменне Радзімы як агульначалавечай каштоўнасці, звязанай з тэмамі сям’і, сяброўства, гісторыі, прыроды.

У **параграфе 3.2.2 «Цыкл перадач «Вецер вандраванняў» як прастора для палілогу і фактар грамадскага развіцця»** шляхам параўнання перадач «Вецер вандраванняў» (Студыя беларускага тэлебачання, Белтэлерадыёкампанія, 1966–1992 гг.) і «Клуб путешественников» (Цэнтральнае тэлебачанне СССР, РДТРК «Астанкіна», 1977–2003 гг.) паказана, што на беларускім тэлебачанні сфарміраваўся турыстычны нарыс, які развіваўся ў рэчышчы еўрапейскай аўдыявізуальнай культуры, мае фенаменальную прыроду, таму што ўздзейнічаў на грамадскі кантэкст і тэлевытворчасць, вызначыў тэндэнцыі развіцця тэлепадарожжа, актуальныя ў XXI ст., – роля аўтара-аператара, узмацненне аўтабіяграфічнага характару перадачы, стварэнне вакол яе сеткі камунікацыі, паглыбленне нацыянальных матываў і публіцыстычнага складніка. З’яўляючыся часткай дыскурсу сваіх стваральнікаў, савецкай навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, у тым ліку турыстаў-аматараў, самадзейных аўтараў-выканаўцаў, «Вецер

вандраванняў» садзейнічаў укараненню ў паўсядзённым ужытку навуковай лексікі, павышэнню прэстыжу тэарэтычных ведаў і адукацыі. У праграме пачалі выкарыстоўвацца элементы шоу, прыёмы «сэлфі» і жывой камеры, дакументальны авантурны пачатак, іронія і самаіронія, лексічная гульня і эпатаж. Паказана, што стваральнікі «Клуба путешественников» нярэдка пераймалі вопыт аўтараў «Ветру вандраванняў».

У **главе 4. «Тэндэнцыі развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса ў нацыянальнай інфармацыйнай прасторы»** паказана, што на мяжы ХХ–ХХІ стст. ва ўмовах фарміравання забаўляльнай і рэкламнай функцый тэлебачання беларускі тэлевізійны падарожны нарыс, не губляючы сваіх асноўных адметнасцей, развіваецца ў гібрыдных формах тэлефільма, цыклавой перадачы, травелогу, турыстычнага падарожжа. Вызначаны асноўны кірунак развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса – узмацненне рэпартажнасці. Абгрунтоўваюцца перспектывы рамантычнага турыстычнага нарыса.

У **раздзеле 4.1 «Рэпартажныя тэндэнцыі ў тэлефільмах і цыклавых перадачах аб падарожжах»** вылучаны адметнасці, якія збліжаюць падарожны нарыс з рэпартажам, у тым ліку імкненне да аб’ектыўнасці выкладу падзей, узмацненне дынамікі аповеду, павелічэнне колькасці лічбаў у паведамленні, рэалізацыя публіцыстычнага і філасофскага складнікаў не ў закадравым тэксце, а вуснамі персанажаў. Суб’ектывізм як аблігаторная прыкмета жанру становіцца факультатыўным прыёмам. Неапраўдана забытыя экалагічная і сацыяльная праблематыка падарожнага нарыса. Акрамя таго, паказана вяртанне да ідэй і вобразаў мадэрнізму (глабальны свет, тэхнічны прагрэс).

У **раздзеле 4.2 «Травелог як сучасная форма падарожнага тэленарыса»** на прыкладзе выпускаў «Падарожжа дылетанта» і «Я хочу это увидеть!» паказана, што аўдыявізуальныя падарожныя нарысы пераходзяць у інтэрнэт, дзе назіраецца паступовае ўзмацненне публіцыстычнага складніка, які ў перадачах канца ХХ – пачатку ХХІ ст. быў аслабленым. Жанр спрыяе развіццю духоўнай культуры беларускага народа. Паглыбляецца вобраз вядучага-інтэлігента, аўтары імкнуцца асэнсаваць айчынную гісторыю як частку еўрапейскага мінулага, вызначаюцца тэмы павагі да роднай мовы, захавання архітэктурных каштоўнасцей. Падарожны нарыс садзейнічае ўзмацненню сацыяльнай ініцыятывы і грамадзянскай адказнасці, развіваецца як пляцоўка для суаўтарства творцаў з розных галін дзейнасці. Гэтым вызначаюцца яго перспектывы ў час распаўсюджання партатыўнай відэатэхнікі і развіцця блогерства. Для іх найбольш поўнай рэалізацыі неабходна выкарыстоўваць выпрацаваныя вопытам і несправядліва забытыя прыёмы, у тым ліку мастацкі сімвалізм, культ сяброўства і інш.

У **раздзеле 4.3 «Турыстычны нарыс і яго перспектывы ў сучаснай інфармацыйнай прасторы»** даказана, што турыстычны нарыс запатрабаваны ў глабальнай аўдыявізуальнай прасторы – на тэлебачанні і ў інтэрнэце. Аднак

аўтары звяртаюцца пераважна не да айчыннага вопыту, а да замежнай і глабальнай праблематыкі, а таксама да вобразаў масавай культуры. Больш за ўсё увагі надаюць абвостранай дынаміцы паведамлення, каб яе забяспечыць, паглыбляюць дакументалізм перадач, ствараюць ілюзію прамаэфірнасці. Адметнымі сродкамі мастацкай выразнасці сталі словы са значэннем вышэйшай ступені якасці, займеннік «ты» ў абагульненым сэнсе, рытарычныя пытанні, графіка. Для стварэння канкурэнтаздольных перадач неабходна ўлічваць нацыянальную спецыфіку турыстычнага нарыса, у тым ліку рамантычную скіраванасць, развіваць тэмы прыроды, Радзімы, этнаграфіі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. У адпаведнасці з сістэмным падыходам, які развівае погляды тэарэтыкаў друкаванай журналістыкі і літаратуры, тэлевізійны падарожны нарыс разглядаецца як гістарычна сфарміраваны устойлівы спосаб засваення і адлюстравання рэчаіснасці, што характарызуецца ўласцівым яму наборам адметнасцей, у тым ліку абвостранай дынамікай паведамлення, звязанай з прадметам адлюстравання, якім з’яўляецца працэс перамяшчэння ў геаграфічнай прасторы. Падарожныя тэленарысы практычна пазбаўлены забаўляльнага пачатку, іх асноўная функцыя крытычная, аўтары імкнуцца стварыць у аўдыторыі цэласнае і несупярэчлівае ўяўленне аб пэўнай геаграфічнай мясцовасці з пазіцыі перавагі той культуры, да якой яны сябе адносяць. Для гэтага выкарыстоўваецца сістэма фактаў і аргументаў, чым абумоўлены публіцыстычны складнік жанру (на беларускім тэлебачанні да канца 1970-х гг. падарожныя нарысы пераважна выходзяць у рэдакцыі грамадска-палітычных перадач). Метад выкладу ў падарожным нарысе вызначаецца суб’ектывізмам, яскравым аўтарскім пачаткам. Ён захоўваецца нават падчас фарміравання калектыўнага характару аўдыявізуальнай творчасці (тэрмін «аўтар-аператар» ужываецца ў мікрафонных папках перадач беларускага тэлебачання з пачатку 1970-х гг.). Гэта робіць падарожны тэленарыс асабліва запатрабаваным ва ўмовах узмацнення персаніфікацыі інфармацыі, што назіраецца на тэлебачанні і ў інтэрнэце. У перадачах жанру вызначаецца спалучэнне філасофскіх разваг (аб узамадзенні чалавека і прыроды, асобы і грамадства, працэсе сацыяльнага развіцця) з прыёмамі мастацкай тыпізацыі [2,5,8].

2. Нарыс беларускага тэлебачання развівае традыцыю нацыянальнай літаратурнай школы падарожнай журналістыкі. У працэсе дыяхранічнага даследавання, якое ўключае параўнальна-гістарычны аналіз і кантэнт-аналіз мікрафонных папак на падставе сфарміраванай жанравай мадэлі, устаноўлена, што аўтары першых перадач аб вандроўках выдатныя беларускія пісьменнікі, у тым ліку І. Мележ, С. Грахоўскі, Г. Бураўкін, У. Караткевіч, выкарыстоўвалі ў

тэкстах добра распрацаваныя прыёмы выразнасці друкаванага падарожнага нарыса. У пераважнай большасці даследаваных архіўных сцэнарыяў перадач ужываюцца алітаратурванне аўтарскай асобы, дыялагізаваны маналог, мастацкая тыпізацыя і філасофскія абагульненні, ухваленне прыроды, з другой паловы 1970-х гг. усе часцей выкарыстоўваюцца іронія і самаіронія, інтэртэктуальнасць.

У працэсе тэхнічнага ўдасканалення тэлебачання і распрацоўкі формаў перадач (гутаркі, ілюстраванага апавядання, тэлечасопіса, тэлеклуба, тэлефільма, цыклавой праграмы, травелогу і інш.) фарміруюцца адметныя аўдыявізуальныя сродкі і прыёмы мастацкай выразнасці падарожнага тэленарыса. Для рэалізацыі аўтарскага пачатку выкарыстоўваюцца міміка, інтанацыя (з сярэдзіны 1950-х гг.), прыём «сэлфі» (з сярэдзіны 1970-х гг.). Узмацненню публіцыстычнасці паведамлення спрыяе увод фота- і кінадакументаў (з сярэдзіны 1960-х гг.). Мастацкую і філасофскую скіраванасць жанру забяспечваюць з сярэдзіны 1950-х – у 1960-я гг. масштаб планаў, ракурс, святло, палікамернасць, графіка, з 1970-х гг. – яшчэ і спецэфекты, колер, а таксама аўтарскія прыёмы (суб’ектыўная і «жывая» камера, персаніфікацыя аўдыторыі і здымачнай групы, увод героя-маскі і інш.), з 1990-х гг. рэгулярна выкарыстоўваецца план-дэталь у візуальным шэрагу. У 1970–1980-я гг. фарміруецца асаблівая тэлевізійная мова падарожнага нарыса, для якой уласціва выкарыстанне акалічнасцей месца, кароткіх формаў дзеепрыметнікаў, указальных займеннікаў, акругленых лічбаў, тропаў з яркай эмацыянальна-ацэначнай афарбоўкай, займенніка «ты» ў абагульненым сэнсе, метанімій, жарганізмаў, часу дзеясловаў у пераносным значэнні, рытарычных пытанняў [2,5,11,12,16].

3. У развіцці падарожнага нарыса прасочваецца шэраг заканамернасцей – тэндэнцый, якія паўтараюцца ў яго розных жанравых формах. Па-першае, вызначаецца тэма Радзімы, айчына пачынае асэнсоўвацца як агульначалавечая каштоўнасць, звязаная з тэмамі сям’і, сяброўства, прыроды, гісторыі, чым абумоўлены высокі патэнцыял жанру ў выхаванні ў аўдыторыі пачуцця патрыятызму, грамадзянскай адказнасці, развіцці нацыянальнай ідэі. Па-другое, змяняюцца адносіны аўтараў перадач да гістарычнага мінулага – «ад цёмнага часу» ў сярэдзіне 1950-х – у 1960-я гг. да крыніцы вопыту з сярэдзіны 1970-х гг. (перадачы «Улицы и площади рассказывают», «Спадчына», «Вецер вандраванняў» і інш.). Узмацняюцца тэмы захавання гісторыка-культурнай спадчыны і роднай мовы, з імі звязаны тэма аховы прыроды і сацыяльная праблематыка. Па-трэцяе, паглыбляецца псіхалагізм вобраза аўтара-апавядальніка: ён эвалюцыянуе ад ідэальнага савецкага грамадзяніна да інтэлігента-рамантыка з аўдыторыі. Канфлікт перадачы змяняецца ад знешняга – супрацьстаяння камуністычнага і капіталістычнага грамадства (сярэдзіна 1950-х – пачатак 1970-х гг.) да канфлікту героя з соцыумам, з прыродай і з самім сабой (сярэдзіна 1970-х – 1990-я гг.), антрапацэнтрызм жанру вядзе да збліжэння

падарожнага нарыса з партрэтным (з 1970-х гг. XX ст.) і праблемным (асабліва з другой паловы 1980-х гг.). Характар дыялогу аўтара з аўдыторыяй трансфармуецца ад імкнення паведаміць і пераканаць да камунікацыі – споведзі, дыскусіі і нават палемікі (у сярэдзіне 1980-х – у 1990-я гг.). Узмацняецца мастацка-філасофская скіраванасць жанру: стваральнікі перадач спачатку пераймаюць літаратурныя вобразы-сімвалы (дрэва Вечнасці (У. Караткевіч), мора і карабель (А. Грын), Маленькі прынц (А. дэ Сент-Экзюперы)), а з канца 1970-х гг. пачынаюць выпрацоўваць уласныя лейтматывы (кветка-эдэльвейс, свечка, Арык Круп). Характэрна, што, нягледзячы на абмежаванні савецкіх ідэалагічных схем, падарожны тэленарыс эвалюцыянаваў у рэчышчы еўрапейскіх тэндэнцый, прасочваюцца аўтабіяграфічны характар выпускаў, дакументальны авантурны пачатак, інтэрактыўнасць, чым вызначаецца важная роля падарожнага тэленарыса ў працэсах інтэграцыі беларускага тэлебачання ў сусветную аўдыявізуальную культуру [1,4,6–8,10,15,17–19].

4. Турыстычны нарыс развіваўся ў тэлеклубах для кінааматараў 1970-х гг. (кшталту «Мы и наша кинокамера») і яркага ўвасаблення дасягнуў у перадачы «Вецер вандраванняў» (1966–1992 гг.). Ён сфарміраваўся як частка грамадскага кантэксту (звязаны з дыскурсам савецкай навукова-тэхнічнай інтэлігенцыі, у тым ліку турыстаў-аматараў, паэтаў-песенікаў), а потым стаў уздзейнічаць на сацыяльнае жыццё, што дазваляе назваць яго феноменам айчыннай аўдыявізуальнай культуры. Жанр спрыяў захаванню гісторыка-культурных каштоўнасцей, вырашэнню праблем экалогіі і сацыяльнага развіцця. У турыстычным нарысе была рэалізавана аблігаторная функцыя падарожнага нарыса як з’явы культуры – фарміраванне і распаўсюджанне навуковай карціны рэчаіснасці. Выкарыстоўваючы гульнёвую прыроду тэлебачання, уводзячы элементы шоу, стваральнікі перадач дапамагалі ўкараненню ў паўсядзённым ужытку навуковай лексікі, павышэнню прэстыжу адукацыі і тэарэтычных ведаў.

Турыстычны нарыс аб’ядноўваў прафесійных тэлетворцаў і аматараў, садзейнічаў фарміраванню грамадскай ініцыятывы і пошуку сацыяльнага кансэнсусу, ствараў «сетку камунікацыі», у ім прасочваюцца праявы мультымедыйнасці і канвергентнасці, яго вопыт запатрабаваны ў XXI ст. у час імклівага развіцця грамадскай журналістыкі. Пры дапамозе відэахостынгаў і сацыяльных сетак пажадана ствараць турыстычныя нарысы ў выглядзе мультымедыйных платформаў, кантэнт на якіх будуць размяшчаць карыстальнікі з розных краін свету, а іх дарадцамі, захавальнікамі вопыту, стануць прафесійныя журналісты. Такая практыка паспрыяе павышэнню запатрабаванасці і канкурэнтаздольнасці айчынных фарматаў перадач аб падарожжах на рынку аўдыявізуальных паслуг, інтэграцыі беларускай культуры ў сусветную супольнасць [3,9,14].

5. У аўдыявізуальнай прасторы XX–XXI стст. тэлевізійны нарыс існуе ў формах тэлефільма, травелогу, цыклавой перадачы, у якіх развіваецца сістэма ўласцівых жанру прыкмет, прыёмаў і сродкаў выразнасці. Параўнальна-гістарычны аналіз сучасных перадач са сцэнарыямі і запісамі праграм беларускага савецкага тэлебачання дазваляе вызначыць зніжэнне публіцыстычнасці падарожнага нарыса, кірунак на збліжэнне з рэпартажам: аўтары імкнуцца да аб’ектыўнага выкладу падзей, праблемныя пытанні агучваюцца пераважна вуснамі персанажаў. Назіраецца вяртанне да ідэй мадэрнізму (глабальны свет, тэхнічны прагрэс), асноўны канфлікт перадач выносіцца за межы свайго грамадства, паглыбляюцца эфект прысутнасці і дакументалізм выпускаў. Зніжаецца мастацкі складнік падарожнага нарыса: аўтары карыстаюцца пераважна вобразамі масавай культуры і не ствараюць уласныя лейтматывы. Разам з тым значныя перспектывы ў сучаснай аўдыявізуальнай прасторы (як на тэлебачанні, так і ў інтэрнэце) мае тэлевізійны падарожны нарыс у форме травелогу. У ім вызначаецца імкненне аўтараў абгрунтаваць сувязь мінулага Беларусі з еўрапейскай гісторыяй, што садзейнічае фарміраванню ў аўдыторыі пачуцця нацыянальнага гонару і годнасці, развіццю духоўнай культуры народа. Каб найбольш поўна рэалізаваць адукацыйна-выхаваўчы патэнцыял травелогу, неабходна ўзнавіць выкарыстанне выпрацаваных вопытам і несправядліва забытых сродкаў, у тым ліку аўдыяльных, візуальных і графічных спецэфектаў, актуальнасць якіх дэтэрмінавана імклівым развіццём тэхнікі, а таксама матыву расследавання, мастацкага сімвалізму, інтэртэкстуальнасці, паглыбіць сувязь выпускаў з нацыянальнай літаратурай, выяўленчым і музычным мастацтвам [3,6,18].

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

*Артыкулы ў рэцэнзаваных навуковых выданнях*

1. Марозава, А. І. Эвалюцыя вобраза лірычнага героя ў падарожных нарысах на беларускім тэлебачанні ў 1960–90-ых гг. / А. І. Марозава // Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. – 2018. – № 1.– С. 80–85.

2. Марозава, А. І. Некаторыя жанравыя асаблівасці «гутарак» («ілюстраваных апавяданняў») аб падарожжах 1950–60-х гг. / А. І. Марозава // Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. – 2018. – № 2. – С. 53–58.

3. Марозава, А. І. Рысы відэаблогу ў выпусках тэлеклуба «Вецер вандраванняў» / А. І. Марозава // Полымя. – 2018. – № 2. – С. 142–148.

4. Марозава, А. І. Ролі «інфарматара», «пасрэдніка» і «аўдыторыі» ў тэлепадарожжах 1987–1992 гг: да пытання ўздзеяння жанру на гледача / А. І. Марозава // Роднае слова. – 2018. – № 7. – С. 78–81.

5. Марозава, А. І. Трансфармацыя літаратуры падарожжаў на тэлебачанні (на прыкладзе передачы І. Мележа «Падарожжа вакол Еўропы» (1956 г.)) / А. І. Марозава // Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. – 2019. – № 1. – С. 56–62.

6. Марозава, А. І. Мастацкае асэнсаванне тэмы радзімы ў тэлевізійных падарожных нарысах (на прыкладзе перадач цыкла «Спадчына» У. Караткевіча) / А. І. Марозава // Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика. – 2019. – № 2. – С. 23–31.

7. Марозава, А. І. Кінааматары на тэлебачанні: актуалізацыя суб’ектывізму і мастацкага пачатку ў беларускіх перадачах пра падарожжы 1970-х гг. / А. І. Марозава // Роднае слова. – 2019. – № 9. – С. 87–91.

8. Марозава, А. І. Рэпартажнасць і гістарызм як асноўныя жанравыя адметнасці цыкла «Вуліцы і плошчы апавядаюць» Беларускага тэлебачання / А. І. Марозава // Роднае слова. – 2020. – № 1. – С. 87–91.

*Артыкулы ў зборніках навуковых прац*

9. Марозава, А. І. Эвалюцыя мультымедыйных формаў журналістыкі ў перадачы «Вецер вандраванняў» (1967–1994) / А. І. Марозава // Мультимедийная журналистика : сборник научных трудов Международной научно-практической конференции, Минск, 1–2 марта 2018 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: В. П. Воробьёв [и др.]. – Мінск, 2018. – С. 97–100.

10. Морозова, Е. И. Концепты картины мира в передачах о путешествиях (на примере выпусков телеклуба «Ветер странствий» 1960–1970 гг.) / Е. И. Морозова // Современная философия и национальный культурный ландшафт [Электронный ресурс]: материалы XII междисциплинар. науч.-теорет. семинара «Инновационные стратегии в современной социальной философии», Минск, 21 марта 2018 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: А. И. Зеленков [и др.]. – Минск: БГУ, 2018. – С. 297–304.

11. Марозава, А. І. Аўтарская журналістыка падарожжаў на беларускім тэлебачанні 50–60-х гг. XX ст. (публіцыстыка І. Мележа і С. Грахоўскага) / А. І. Марозава // Слова ў кантэксце часу: да 90-годдзя прафесара А. І. Наркевіча : зб. навук. прац / пад агул. рэд. В. М. Самусевіч. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2019. – С. 282–286.

12. Марозава, А. І. Эвалюцыя сцэнарных жанравых формаў падарожных нарысаў беларускага тэлебачання 50–60-ых гг. XX ст. / А. І. Марозава // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: зб. навук. арт. Вып. 1 / гал. рэд. А. І. Лакотка; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. – Мінск, 2020. – С. 298–301.

*Матэрыялы канферэнцый*

13. Марозава, А. І. Да пытання драматургіі тэлепадарожжа: суб’ектывізм і лірычны герой / А. І. Марозава // Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 19-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі,

Мінск, 16–17 лістапада 2017 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: С. В. Дубовік [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 119–122.

14. Марозава, А. І. Асаблівасці беларускага тэлевізійнага трэвел-дыскурсу (на прыкладзе тэлеклуба «Вецер вандраванняў») / А. І. Марозава // Профессиональная коммуникативная личность в институциональных дискурсах: тезисы докладов международного круглого стола, Минск, 22–23 марта 2018 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол: О. В. Лущинская [и др.]. – Мінск, 2018. – С. 65–67.

15. Марозава, А. І. Адлюстраванне светапогляду мадэрнізму ў тэлеперадачах аб падарожжах 60–70-х гг. ХХ ст. /А. І. Марозава // 75-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета [Электронный ресурс]: материалы конф. В 3 ч., Минск, 14–23 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т, Гл. упр. науки; редкол.: В. Г. Сафонов [и др.]. – Минск: БГУ, 2018. – С. 457–462.

16. Марозава, А. І. Асаблівасці драматургіі і жанравай формы падарожнага нарыса Беларускага тэлебачання ў перадачы «Падарожжа вакол Еўропы» І. Мележа (1956 г.) / А. І. Марозава // Журналістыка-2018: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 20-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 15–16 лістапада 2018 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 176–179.

17. Марозава, А. І. Адметнасці жанравай формы цыклавых перадач беларускага тэлебачання аб падарожжах 60–70-ых гг. / А. І. Марозава // Аудиовизуальные медиа в условиях трансформации социокультурной среды: материалы Международной научно-практической конференции, Минск, 5 апреля 2019 г. / Белорус. гос. ун-т; редкол.: В. М. Самусевіч [и др.]. – Мінск, 2019. – С. 104–110.

18. Марозава, А. І. Беларускі тэлевізійны падарожны нарыс: асноўныя фактары развіцця жанру / А. І. Марозава // Журналістыка-2019: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 21-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 14–15 лістапада 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 265–269.

19. Марозава, А. І. Цыкл «Спадчына» У. Караткевіча як крыніца вопыту для рэгіянальнага тэлебачання Беларусі / А. І. Марозава // Рэгіянальныя СМІ Рэспублікі Беларусь у лічбавую эпоху: ад лакальнай праблематыкі да інфармацыйнай бяспекі дзяржавы: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 5 мая 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В. М. Самусевіч [і інш.]. – Мінск, 2020. – С. 229–234.

## РЭЗЮМЭ

**Марозава Алена Ігараўна**

## ПАДАРОЖНЫ НАРЫС НА БЕЛАРУСКІМ ТЭЛЕБАЧАННІ: ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРУ

**Ключавыя словы**: жанр, жанраствaральныя прыкметы, сродкі і прыёмы мастацкай выразнасці, эвалюцыя, нацыянальная аўдыявізуальная культура, рамантычны турыстычны нарыс, гісторыя беларускага тэлебачання.

**Мэта даследавання** – вызначэнне асаблівасцей функцыянавання і развіцця тэлевізійнага падарожнага нарыса як з’явы нацыянальнай аўдыявізуальнай культуры ў гістарычным аспекце.

**Асноўныя метады даследавання:** сістэмны падыход, дыяхранічны падыход (семіятычны і параўнальна-гістарычны метады), дыскурс-аналіз, кантэнт-аналіз і міждысцыплінарная метадалогія.

**Вынікі даследавання і іх навуковая навізна.** Комплексна даследаваны працэс станаўлення і развіцця публіцыстычнага тэлевізійнага падарожнага нарыса. Упершыню ў якасці аб’екта навуковага даследавання выступаюць гутаркі і ілюстраваныя апавяданні аб падарожжах аўтарства І. Мележа, С. Грахоўскага, Г. Бураўкіна, выпускі перадачы «Спадчына» У. Караткевіча і інш. Паказана роля тэлевізійнага падарожнага нарыса ў захаванні і трансляцыі каштоўнасцей нацыянальнай культуры, вылучаны феномен рамантычнага турыстычнага нарыса, вызначаныя перспектывы развіцця жанру на сучасным тэлебачанні і ў інтэрнэце, яго роля ва ўдасканаленні зместу сучасных перадач аб падарожжах, павышэнні іх грамадска-палітычнай вартасці.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні.** Апублікаваныя вынікі дысертацыі могуць выкарыстоўвацца тэлекампаніямі і канвергентнымі рэдакцыямі СМІ для распрацоўкі ўнікальных і канкурэнтаздольных фарматаў перадач аб падарожжах, што ўзмацніць пазітыўны імідж Беларусі ў свеце, прывабнасць краіны для турыстаў і замежных інвестараў. Прадстаўленыя вынікі могуць быць ужытыя ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы тэлевізійных рэдактараў, сцэнарыстаў, рэжысёраў, мастацтвазнаўцаў, культуролагаў, музыказнаўцаў, гісторыкаў. Лагічным працягам гэтай работы могуць стаць гісторыка-культурнае даследаванне ўсіх жанраў беларускай нацыянальнай школы тэлевізійнай журналістыкі, што дазволіць атрымаць аб’ектыўнае ўяўленне аб іх сучасным стане і перспектывах развіцця, а таксама даследаванні па айчыннай гісторыі, мастацтвазнаўству, музыказнаўству.

**Галіна выкарыстання атрыманых вынікаў:** навуковая дзейнасць, журналісцкая практыка, адукацыйны працэс.

# РЕЗЮМЕ

**Морозова Елена Игоревна**

## ПУТЕВОЙ ОЧЕРК НА БЕЛОРУССКОМ ТЕЛЕВИДЕНИИ: ЭВОЛЮЦИЯ ЖАНРА

**Ключевые слова:** жанр, жанроформирующие признаки, средства и приёмы художественной выразительности, эволюцыя, национальная аудиовизуальная культура, романтический туристический очерк, история белорусского телевидения.

**Цель исследования**: установить особенности функционирования и развития тэлевизионного путевого очерка как явления национальной аудиовизуальной культуры в историческом аспекте.

**Основные методы исследования:** системный подход, диахронический подход (семиотический и сравнительно-исторический методы), дискурс-анализ, контент-анализ и междисциплинарная методология.

**Вынікі даследавання і іх навуковая навізна**: комплексно исследован процесс становления и развития публицистического телевизионного путевого очерка. Впервые в качестве объекта научного исследования выступают беседы и иллюстрированные рассказы о путешествиях авторства И. Мележа, С. Граховского, Г. Буравкина, выпуски передачи «Спадчына» В. Короткевича и др. Показана роль телевизионного путевого очерка в сохранении и трансляции ценностей национальной культуры, выделен феномен романтического туристического очерка, определены перспективы развития жанра на современном телевидении и в интернете, его роль в совершенствовании содержания современных передач о путешествиях, повышении их общественно-политической значимости.

**Рекомендации по практическому использованию.** Опубликованные выводы могут использоваться телекомпаниями и конвергентными редакциями СМИ для разработки уникальных форматов передач о путешествиях, што усилит позитивный имидж Беларуси в мире, притягательность страны для туристов и зарубежных инвесторов. Представленные результаты могут быть использованы в учебном процессе при подготовке телевизионных редакторов, сценаристов, режиссёров, искусствоведов, музыковедов, историков. Логичным продолжением этой работы могут стать историко-культурное исследование всех жанров белорусской национальной школы телевизионной журналистики, што позволит получить объективное представление об их современном состоянии и перспективах развития, а также исследования по отечественной истории, искусствоведению, музыковедению.

**Отрасль применения полученных результатов:** научная деятельность, журналистская практика, образовательный процесс.

## SUMMARY

**Morozowa Elena Igorevna**

## TRAVEL ESSAY ON BELARUSIAN TV: GENRE EVOLUTION

**Keywords:** genre, genre-forming signs, means and techniques of artistic expression, evolution, national audiovisual culture, tourist essay, history of Belarusian television.

**Objective of research:** To identify the features of the functioning and development of the television travel essay as a phenomenon of the national audiovisual culture in a historical aspect.

**Basic research methods:** systematic approach, diachronic approach (semiotic and comparative historical methods), discourse analysis, content analysis and interdisciplinary methodology.

**Obtained results and its scientific novelty:** comprehensively investigated the process of formation and development of a journalistic television travel essay. For the first time, conversations and illustrated travel stories by I. Melezh, S. Grakhovsky, G. Buravkin, issues of the "Spadchyna" program by U. Karatkevich investigate the object of scientific research. The role of a television travel essay in the preservation and transmission of the values of national culture is shown, the phenomenon of a tourist essay is highlighted, the prospects of the development of the genre on modern television and in the Internet, its role in improving the content of modern travel programs, increasing their socio-political significance are identified.

**Recommendations for the practical use.** Theoretical and practical results can be used by Belarusian TV channels and converged media to develop unique travel transmission formats, which will strengthen Belarus's positive image in the world, and the country's attractiveness for tourists and foreign investors. The presented results can be used in the educational process in the preparation of television editors, screenwriters, directors, art historians, musicologists. A logical continuation of this work can be a historical and cultural study of all genres of the national school of Belarusian television journalism, which will allow you to get an objective idea of their current status and development prospects, as well as research on domestic history, art, musicology.

**Application field:** scientific activity, journalistic practice, educational process.



Подписано в печать 21.09.2020 г. Формат 60x84/16. Бумага офсетная.
Печать офсетная. Усл. печ. л. 1,16. Уч.-изд. л. 1,31.
Тираж 60 экз. Заказ 341.

Республиканское унитарное предприятие «Информационно-вычислительный центр Министерства финансов Республики Беларусь».
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий
№2/41 от 29.01.2014.
Ул. Кальварийская, 17, 220004, г. Минск.